неаінтуітывісцкія канцэпцыі; 3) ірацыяналісцка-антрапалагічныя канцэпцыі: фрэйдызм і неафрэйдызм; 4) неапазітывізм у эстэтыцы; 5) прагматычная эстэтыка; 6) пазітывісцкая эстэтыка; 7) элітарныя і масавыя канцэпцыі мастацтва.

Раздзел "Эстэтычная культура грамадства" разглядае сукупнасць эстэтычных поглядаў і густаў, праяў эстэтычнай дзейнасці, з'яў мастацкага жыцця, формаў, спосабаў засваення эстэтычных каштоўнасцей, што складае эстэтычную культуру грамадства.

У задачы эстэтыкі ўваходзяць вызначэнне і вывучэнне законаў развіцця эстэтычнай культуры, яе сутнасці, ролі ў сацыяльным жыцці. Неабходна разгледзець шляхі пераходу ад традыцыйнай культуры развітага буржуазнага грамадства да пачатку новага, пераходнага этапу ў гісторыі культуры, а таксама праблемы постмадэрнізму. Важнейшым момантам, на якім трэба засяродзіць увагу, з'яўляецца фарміраванне эстэтычнай культуры грамадства.

**А.Л.Карацееў**, *дацэнт*

## РОЛЯ ПРАГРЭСІЎНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДУХАВОГА МАСТАЦТВА Ў ПРАЦЭСЕ РАСПРАЦОЎКІ СУЧАСНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ СТАНДАРТАЎ

Поспехі сучаснага музычнага мастацтва патрабуюць падрыхтоўкі спецыялістаў, здольнай забяспечыць яго развіццё. Пэўныя праблемы існуюць у сферы духавога выканання. Узнікае неабходнасць вызначэння параметраў, што складуць аптымальную мадэль, з'явяцца стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў гэтай галіны. Вывучэнне гісторыі фарміравання, развіцця сусветнага і нацыянальнага духавога мастацтва дазваляе вылучыць асноўныя тэндэнцыі адукацыйнага працэсу:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1) індывідуальнае навучанне музыкантаў-пачаткоўцаў і развіццё іх творчых навыкаў шляхам нагляднага паказу асаблівасцей гукавыяўлення, асваення аплікатуры, тэхналагічных сакрэтаў (такі вопыт перадачы выканальніцкага майстэрства быў характэрны яшчэ на досвітку цывілізацыі, у тым ліку для музыкантаў старажытных плямёнаў на тэрыторыі Беларусі; ён пашырыўся у народна-інструментальнай практыцы і цяпер выкарыстоўваецца ў сучасным прафесійным навучанні музыкантаў);

2) пошукі эфектных прыёмаў тэхнікі ігры лепшымі музыкантамі, перайманне іх калегамі з іншых краін свету: у XIV—першай палове XV ст. у час выканання грыгарыянскага харала на яго апошнім складзе еўрапейскія музыканты-інструменталісты, у тым ліку выканаўцы на духавых інструментах — флейце, шалмеі, померы, карнеце, пачалі выкарыстоўваць свабодна імправізацыйныя забаўляльна-арнаментальныя пабудовы, што называліся юбіляцыямі, для захавання сэнсавага адзінства разгорнутых музычных фраз, уласцівых творам старадаўняй музыкі. Сучасныя выканаўцы на духавых інструментах асвойваюць адзін з самых складаных прыёмаў — перманентнае дыханне. Вельмі арыгінальна ў сучасных музыкантаў-духавікоў гучаць прыёмы subton, frulato і інш.;

3) зварот да правядзення сумесных ансамблевых рэпетыцый як найбольш прымальны падыход навучання. Гэтую форму выкарыстоўвалі, напрыклад, у "бурсах музычных" пры езуіцкіх манастырах у канцы XVI ст. у Беларусі, у "кансерваторыях" — дзіцячых прытулках пры храмах Італіі ў першай палове XVIII ст., аналагічных установах Германіі гэтага ж перыяду — інстытутах "бедных школьнікаў". Між іншым ансамблевае музіцыраванне ўключана ў сучасныя праграмы спецыяльных навучальных устаноў мастацтва і культуры;

4) распрацоўку зместу спецыяльнай падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах да работы

ў аркестравых калектывах з улікам спецыфікі (камерны, сімфанічны, духавы, эстрадны склады).

Для ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва неабходна вывучаць прагрэсіўныя тэхналогіі, распрацаваныя ў айчыннай і сусветнай выканальніцкай практыцы і педагогіцы. У гэтым плане цікавыя працы такіх сусветна вядомых аўтараў, як Ж.Арбан, І.Буш, Р.Кінг, Т.Кларк, Ч.Колін, Л.Маджыо, Ч.Маргуліс, В.Тык, М.Шлосберг. Выкладчыкам і навучэнцам трэба звярнуцца да прац еўрапейскіх спецыялістаў, сярод якіх неабходна адзначыць В.Апацкага, К.Бора, Т.Докшыцара, П.Карпарава, Г.Крумпфера, І.Любіка-Шода, Л.Лютага, Г.Орвіда, М.Табакова, Ю.Вусава. Пытанні музычнай педагогікі, засваення складаных выканальніцкіх прыёмаў адлюстраваны ў публікацыях такіх вядучых спецыялістаў Беларусі, як Л.Акапджанян, В.В.Волкаў, М.М.Волкаў, Р.Лагода, І.Мангушаў, Б.Нічкоў і інш.

Задача выкладчыка, які эксперыментуе, шукае аптымальных шляхоў падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых інструментах, заключаецца не толькі ў папулярызацыі методык названых аўтараў, але і ў аналізе дасягненняў, што вызначаюць сучасны ўзровень музыкантаў на аўтарытэтных міжнародных конкурсах і фестывалях духавога мастацтва. Звесткі аб гэтым, а таксама лепшыя "майстар-класы" і іншае, можна атрымаць у час прагляду тэлевізійных трансляцый, рэпартажаў, кінафільмаў, відэазапісаў, вывучэння матэрыялаў друкаваных выданняў — спецыялізаваных часопісаў "Российский брасс-вестник", "Brass Bulletin: International magazin for brass players" (Швецыя) і інш.

Немалое значэнне ў працэсе асваення выканальніцкай тэхнікі маюць прыстасаванні, тэхнічныя сродкі навучання. Канструктар сучасных медных духавых інструментаў амерыканец В.Бах наладзіў вытворчасць спецыяльнага прыстасавання пад назвай vizualizer, што дазваляе музыкантам вызначаць і кантраляваць размяшчэнне мундштука на губах, ступень сабранасці мышцаў губ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

памеры апертуры, актыўнасць яе вібрацыі. Вялікі эфект у працэсе асваення медных духавых інструментаў робіць выкарыстанне іншага прыстасавання, упершыню ўжытага ў навучальным працэсе Вышэйшай музычнай школы імя Г.Эйслера ў Германіі. Гэты прыбор прызначаны для вымярэння ступені ціску мундштука на мышцы губ выканаўцы.

Разглядаючы прагрэсіўныя сусветныя тэхналогіі, адзначым выкарыстанне ў педагагічнай, канцэртна-выканальніцкай практыцы конусападобнага прыбора для кампенсацыі фізічных затрат у асваенні прыёму "bazing" — прыстаўкі для супраціўлення "B.E.R.P." (Buzz Extention Resistance Piece). Прыстасаванне, створанае ў 1986 г. Дж.Кетчумам і М.Гварнелі, адразу было ацэнена музыкантамі. Нельга не прыгадаць і прагрэсіўнай мадэлі "Mega ton", распрацаванай фірмай "Selmer" на падставе мадэлі "V.Bach". Адгукнуліся музыканты і на вынаходства амерыканскіх канструктараў 1990-х гадоў "Peacemaker", што дазваляла музыканту, займаючыся на медным духавым інструменце ў поўнай дынаміцы, чуць толькі сябе па прынцыпе медыцынскага фанендаскопа і не перашкаджаць навакольным. Гэтае прыстасаванне незаменнае ў час самастойных заняткаў дома, у інтэрнаце, гасцініцы.

Адзначым: усе пералічаныя тэхнічныя прыстасаванні выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе для падрыхтоўкі спецыялістаў рэспублікі, што дазваляе гаварыць аб яго прагрэсіўным характары. Таму пры распрацоўцы адукацыйных стандартаў падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва на сучасным этапе трэба браць за аснову найбольш эфектыўныя дасягненні, назапашаныя сусветнай і нацыянальнай педагагічнай, выканальніцкай практыкай.

Пры распрацоўцы сучасных адукацыйных стандартаў актуальным застаецца пытанне незбалансаванасці пераемнасці навучання ва ўсёй сістэме адукацыі духавога мастацтва Беларусі: у пачатковым навучанні ў дзіцячых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычных школах, школах мастацтваў, сярэдне-адукацыйных школах з музычным ухілам, у атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў музычных вучылішчах, вучылішчах культуры, мастацтва, вышэйшай адукацыі ў спецыяльных вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтва, на профільных спецыялізацыях іншых вышэйшых навучальных устаноў.

Вышэйшая форма падрыхтоўкі спецыялістаў ажыццяўляецца па трох асноўных напрамках: 1) падрыхтоўка артыстаў аркестравых калектываў, выкладчыкаў (Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі); 2) спецыяльная падрыхтоўка педагагічных кадраў (педагагічны факультэт Магілёўскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі); 3) падрыхтоўка дырыжораў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў (Беларускі універсітэт культуры, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт). Калі першыя два напрамкі захоўваюць традыцыйны пералік дысцыплін, то ў распрацоўцы стандартаў падрыхтоўкі дырыжораў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў трэба ўлічваць спецыфічныя асаблівасці. Гэта павінна адлюстроўвацца ў пераліку базавых спецыяльных дысцыплін: "Інструментазнаўства і тэорыя інструментоўкі (беларускія народныя і сучасныя аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты)", "Методыка навучання ігры на духавых аркестравых і беларускіх народных духавых інструментах", "Вывучэнне інструментаў духавога аркестра і беларускіх народных духавых інструментаў", "Гісторыя нацыянальнага і сусветнага выканання на духавых і ўдарных інструментах", "Жанрава-стылявыя асаблівасці выканання сучаснай і беларускай музыкі" і інш.

Спецыфіка падрыхтоўкі студэнтаў кафедры духавой музыкі прадугледжвае вывучэнне праблемных пытанняў культуралогіі, мастацтвазнаўства, арганізацыі мастацкай творчасці, тэорыі, гісторыі мастацтваў, педагогікі, псіхалогіі мастацкай творчасці. Акрамя ведаў па базавых дысцыплінах, студэнты спецыялізацыі павінны:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— валодаць тэарэтычнымі асновамі культуралагічных дысцыплін;

— улічваць у паводзінах маральна-этычныя нормы;

— характарызаваць, аналізаваць духоўныя, эканамічныя, сацыяпалітычныя, сацыякультурныя працэсы ў грамадстве;

— набываць веды па дысцыплінах псіхолага-педагагічнага цыкла з мэтай стварэння падчас самастойнай работы з мастацкімі калектывамі спрыяльнай творчай атмасферы, добрага маральна-псіхалагічнага клімату, валодаць навыкамі правядзення педагагічнага эксперыменту, дыягностыкі творчых здольнасцей удзельнікаў мастацкіх калектываў;

— ведаць гісторыю Беларусі, у тым ліку гісторыю выканання на духавых і ўдарных інструментах, у кантэксце сусветнай цывілізацыі;

— класіфікаваць сучасныя мадэлі духавога і ўдарнага інструментарыя;

— аналізаваць сучасныя прагрэсіўныя выканальніцкія школы, прыёмы ігры на духавых і ўдарных інструментах;

— фарміраваць нотную і спецыяльную літаратуру для рэпертуару калектыву і працы з ім.

Такім чынам, пры распрацоўцы аптымальных адукацыйных стандартаў неабходна ўлічваць прагрэсіўныя сусветныя і нацыянальныя тэхналогіі. Гэта дазволіць ажыццяўляць якасную стандартызацыю навучальнага працэсу ў рэчышчы сучасных патрабаванняў да спецыяліста ў галіне духавога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ